культуры, традыцый, менталітэту. Акрамя таго, новыя нормы і стандарты здольныя павысіць якасць адукацыі.

Філасофскія разважанні аб узаемадзеянні старых і новых стандартаў, традыцыйных і новых нормаў дзейнасці могуць выступаць у якасці метадалагічных і светапоглядных арыенціраў.

**Н.М.Хадзінская,** *дацэнт*

## ВЫВУЧЭННЕ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МУЗЫКІ Ў СІСТЭМЕ МУЗЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў ВНУ

Адно з галоўных месцаў у сістэме музычнай адукацыі Беларускага універсітэта культуры, іншых вышэйшых навучальных устаноў мастацтва займаюць цыклы музычна-тэарэтычных і музычна-гістарычных дысцыплін. Традыцыйнай з'яўляецца арыентацыя ў праграмах гэтых дысцыплін на класічную і (праўда, вельмі абмежавана) сучасную музыку. Гэта абумоўлена наяўнасцю вялікай колькасці крыніц інфармацыі аб музыцы мінулага і той часавай аддаленасцю, якая дае магчымасць зрабіць тэарэтычныя абагульненні па пытаннях стылявых накірункаў, кампазітарскіх тэхнік, іншых з'яў музычнага мастацтва.

Пашырэнне часавых межаў, уключэнне ў курсы гісторыі музыкі, аналізу музычных твораў, гармоніі, паліфаніі матэрыялаў па беларускай музычнай творчасці другой паловы — канца XX ст. — неабходная ўмова выхавання сапраўды сучаснага, рознабакова адукаванага спецыяліста, будучага інтэрпрэтатара і прапагандыста музыкі нашых дзён.

На шляху вырашэння гэтай найважнейшай педагагічнай задачы паўстае такая перашкода, як амаль поўная адсутнасць навуковай літаратуры, якая змяшчала б назіранні, апісанні, тэарэтычны аналіз твораў беларускіх

кампазітараў апошніх дзесяцігоддзяў. Асабліва гэта тычыцца творчасці маладых кампазітараў, зусім маладаследаванага пласта сучаснай музыкі. Недахоп інфармацыі ў гэтай галіне ўскладняе вывучэнне шляхоў развіцця беларускага музычнага мастацтва, якое ў перспектыве і будзе ў асноўным вызначацца менавіта творчасцю сённяшняга маладога пакалення беларускіх кампазітараў.

Некаторыя з кампазітараў гэтага пакалення стаяць на парозе творчай сталасці, таму толькі ўмоўна могуць называцца маладымі кампазітарамі. Імёны Ул.Солтана, С.Бельцюкова, В.Кузняцова, А.Елісеенкава, А.Бандарэнкі, В.Капыцько, Ул.Кур'яна добра вядомы ў рэспубліцы. Нямала іх твораў маюць высокія мастацкія якасці, добра прыняты слухачамі. Але ў цэлым індывідуальныя стылі гэтых кампазітараў яшчэ фарміруюцца. Адсюль рухомасць музычнага мыслення, пошукі разнастайных стылявых сродкаў і арыенціраў.

Перш за ўсё звяртаюць на сябе ўвагу разнастайныя праявы цікавасці да музыкі мінулага. Найбольш характэрна паглыбленне ў старадаўнія гістарычныя пласты: выкарыстанне ў якасці крыніц выразных сродкаў кантаў і псалмоў, духоўных вершаў, знаменнага распеву і інш. (шэраг твораў А.Бандарэнкі, В.Кузняцова, С.Бельцюкова, С.Хвашчынскага, В.Капыцько, А.Літвіноўскага).

Першаадкрывальнікам гэтага пласта ў беларускай музыцы стала Л.Шлег (кантаты "Кантавы сшытак", "Скарбонка мінулага", араторыі "Сказ пра Ігара", "Іканастас" і інш.). Маладыя кампазітары актыўна падтрымалі такое пачынанне. Зварот да нацыянальнай архаікі, помнікаў сатаражытнабеларускай і іншых славянскіх культур, духоўнай музыкі (апошняе — шырока распаўсюджаная сёння тэндэнцыя) можна назваць наказам часу. У творчасці беларускіх кампазітараў гэта не проста даніна модзе або іншым кан'юнктурным меркаванням, але і адзнака адраджэння нацыянальнай самасвядомасці. Гэта



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выяўляецца і ў аднаўленні ў правах беларускай мовы, і ў глыбокай цікавасці да нацыянальнай гісторыі, яе твораў і помнікаў. Так, шырока адзначанае ў Беларусі 500-годдзе вялікага першадрукара, асветніка Францыска Скарыны натхніла кампазітараў на стварэнне шэрага твораў, прысвечаных гэтаму дзеячу беларускай і сусветнай культур: араторыі "Іканастас" Л.Шлег, сімфоніі "Францыск Скарына: жыццё і несмяротнасць" Ул.Дарохіна, сімфоніі "Гравюры Скарыны" С.Бельцюкова, "Урачыстага канта" (для хору і аркестра) Э.Наско, харавога канцэрта "Месяцам, сонцам..." Л.Сімаковіч, містэрыі "Францыск" (для баса і аркестра) А.Літвіноўскага і інш. Паказальна тое, што маладыя кампазітары, адчуваючы патрэбнасць часу, стварылі оперы на сюжэты, узятыя з гісторыі беларускага народа: "Князь Наваградскі" А.Бандарэнкі, "Пані Ядвіга" Ул.Солтана.

З'явіліся творы, зыходнай кропкай для задумы якіх паслужылі помнікі беларускай музычнай культуры мінулых стагоддзяў. Так, "Полацкі сшытак" стаў важнай крыніцай выразнасці для балета С.Хвашчынскага "Па старонках Полацкага сшытка", інструментальнага цыкла А.Літвіноўскага "Полацкі сшытак. Новыя мелодыі", "Варыяцый для фартэпіяна" на тэму з "Полацкага сшытка" Е.Шушкевіч. Уяўляецца цікавай і выклікае яркае ўражанне работа В.Капыцько з ананімным зборнікам беларускіх кантаў 1733 г. "Куранты" (назва невядомага раней зборніка і твора В.Капыцько). Твор вабіць тэмбравымі знаходкамі, у якіх шмат вынаходлівасці, вытанчанасці, уласцівых творчай манеры В.Капыцько.

У творчасці маладых беларускіх кампазітараў назіраецца ўжыванне стылявой мадэлі культавай музыкі, настолькі папулярнай цяпер сярод кампазітараў розных рэгіёнаў і пакаленняў. Рэлігійная тэматыка выцесніла нават патрыятычную, грамадскую, а тая заўсёды займала адно з цэнтральных месцаў у музыцы беларускіх кампазітараў усіх пакаленняў.

Да стварэння духоўнай музыкі звяртаюцца А.Бандарэнка, С.Бельцюкоў, В.Кузняцоў, В.Капыцько і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Своеасаблівая, цікавая аркестравая п'еса В.Кузняцова "Медытацыя", якая стала таксама першай часткай маштабнага вакальна-сімфанічнага твора "Откровение. Главы Священного Писания". Музыка перадае стан самапаглыблення, адлучанасці, спакою. Партытура выклікае ў памяці няўлоўны рух "статыкі" ў "Lontano" або іншых творах Д.Лігеці, знакамітага венгерскага кампазітара, заснавальніка тэхнікі статычнай санорнай кампазіцыі. Аднак тут не можа быць гаворкі аб запазычанні або перайманні. Адчуванне застыласці часу сапраўды ўзнікае, але метад В.Кузняцова даволі самабытны.

Аўтары праяўляюць вялікую цікавасць да архаікі: гісторыі Старажытнай Русі, старажытных помнікаў культуры, літаратуры. Так, А.Бандарэнка і В.Кузняцоў не замыкаюцца межамі "мясцовага каларыту", а трактуюць беларускую культуру як адну са славянскіх. Гэтая пазіцыя выказана ў творах А.Бандарэнкі "Урачыстыя песнапенні" (для валторны і фартэпіяна), "Славянская старажытнасць" (для віяланчэлі і фартэпіяна), араторыі "Думы рускія", канцэрце для хору "Пахвала вялікаму князю Уладзіміру" і інш. Творы В.Кузняцова "Адкрыццё", "Прынашэнне" (для камернага аркестра), "Адажыо" (для сімфанічнага аркестра і аргана) адпавядаюць адзначанай тэндэнцыі.

Не выпадковы зварот кампазітараў і да знаменнага распеву, аднак у беларускай музыцы гэты пласт музычнай культуры мінулага зацікавіў пакуль нямногіх кампазітараў. Таму цікавай уяўляецца спроба дакрануцца да гэтай галіны, у прыватнасці ў "Адажыо" В.Кузняцова.

У творах маладых беларускіх кампазітараў можна знайсці і больш звычныя стылістычныя алюзіі — у эпоху барока. На аснове монастылістыкі з ужываннем знешніх контураў варыяцый на basso ostinato, спалучэннем "разгрупаванай" мелодыкі барочнага тыпу і пульсуючага кластэра суправаджэння распрацоўваецца гэты пласт у "Камернай музыцы для габоя, фартэпіяна і струннага аркестра" С.Бельцюкова. У полістылістычным "Канцэрце для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скрыпкі з аркестрам" Зм.Еўтуховіча "бахаўскія інтанацыі", якія тут увасабляюць агульначалавечы пачатак, з'яўляюцца адной з фарбаў разам з элементамі фальклору, сучаснай эстраднай музыкі і інш.

Настальгіяй па рамантычным стагоддзі прасякнуты творы В.Капыцько "Адажыо для Адольфа", "Іграем Чэхава" ("Музычныя ілюстрацыі для малога сімфанічнага аркестра"). В.Капыцько — адзін з маладых кампазітараў, якія пастаянна эксперыментуюць, хутка мяняюць стылявыя арыенціры і захапляюцца "гульнёй з часам": учора гэта былі барока або рамантызм, сёння — беларускі кант, сучасная аўтарская песня ці нават старажытныя кітайскія паэзія і музыка.

Беларускую кампазітарскую моладзь прыцягваюць не толькі спалучэнні розных эпахальных стыляў з сучаснасцю, але і аб'яднанне з'яў, якія могуць належаць адной эпосе і тым не менш быць вельмі аддаленымі адна ад адной. Гаворка ідзе аб спалучэнні музыкі "сур'ёзнай" і бытавой, эстрадна-джазавай.

Удалы прыклад такога ўключэння ўяўляе "Канцэрт для цымбалаў" Ул.Кур'яна. Тры часткі канцэрта — нервовая імпульсіўнасць першай часткі, мяккая лірычная стылізацыя ("Бітлз") другой, рэчытатыўная імправізацыйнасць трэцяй. Лірычнае эстраднае інтэрмецца сярод складаных у інтанацыйных адносінах частак не здаецца чымсьці чужародным. Агульная генетычная роднасць усіх трох сфер выразнасці: сінкапіраванага рытму, імправізацыйнасці і эстраднай песеннасці — не дае распасціся цэламу ў гэтым цікавым творы Ул.Кур'яна.

Аздабляе твор і незвычайная трактоўка салірующых цымбалаў, звыклых у амплуа фальклорнага інструмента з характэрнай выразнасцю пявучага трэмала. Тут у кожнай частцы цымбалы паўстаюць у новым выглядзе: яны імітуюць то ўдарны інструмент (1-я ч.), то гавайскую гітару (2-я ч.).

Неафальклорная лінія — асобная частка творчасці маладога пакалення беларускіх кампазітараў. У развіцці імі беларускага фальклярызму можна вылучыць два шляхі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першы не змяшчае ў сабе новых рашэнняў у параўнанні з 1970-мі гадамі. У яго рэчышчы — творы на народныя тэксты (канцэрт для хору "Купалінка" Ш.Ісхакбаевай і В.Шлеянкова, харавы абрад "Вяселле" В.Кузняцова), яркія, прыгожыя п'есы для народнага аркестра ("Жалейка", "Весялуха" В.Кузняцова, фантазія "З рога ўсяго многа", сюіта "Калядныя ігрышчы" А.Рашчынскага, сюіта для фальклорнага ансамбля "Капыльскія дудары" Ул.Кур'яна і інш.). Другі шлях заключаецца ў змяшчэнні фальклорнага тэматызму ў іншастылявы кантэкст, што таксама не нова для беларускай музыкі. Але якраз на гэтым шляху маладыя аўтары знаходзяць арыгінальныя рашэнні. Падобны творчы метад па-рознаму ўжываецца, напрыклад, у творах В.Кузняцова і Ул.Кур'яна.

Цікава параўнаць два блізкія па аркестравым складзе (народны аркестр) і праграме творы: музычную карціну В.Кузняцова "Палессе" і паэму Ул.Кур'яна "Жураўліная песня Палесся". Абодва гэтыя творы грунтуюцца на сумяшчэнні рознастылявых пластоў, але канкрэтызуецца гэты прыём у іх зусім па-рознаму.

Прыцягваюць увагу слухача спробы маладых кампазітараў, што выходзяць за межы традыцый або падаюць традыцыю з нечаканага пункту гледжання. Гэта творы С.Бельцюкова "Музыка для габоя і магнітафоннай стужкі", "Канцэрт для габоя і камернага аркестра", цікавыя менавіта ў святле новых тэндэнцый, якія яны ўносяць у беларускую музыку. "Музыка для габоя" — гэта адна з першых у Беларусі спроб засваення электраакустычнай музыкі (магнітафонны запіс зроблены з дапамогай камп'ютэра з выкарыстаннем цымбалаў і сінтэзатара).

Канцэрт уяўляе яшчэ адзін узор спалучэння санорных і фальклорных элементаў. У адрозненне ад паэмы Ул.Кур'яна гэтыя элементы аб'ядноўваюцца не ў гарызантальным, а ў вертыкальным аспекце: як тэматычны рэльеф і санорны фон. Санорны пласт утвараецца наборам сродкаў: мікрахраматыкай, кластэрамі, алеаторна-кластэрным



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вібрата, глісанда кластэрамі, шматслойнай фактурай. Пры гэтым партытура вельмі багатая на разнастайныя спосабы гукаатрымання як у партыі струнных, так і ў віртуознай партыі габоя.

Твор радуе не толькі тэмбравымі знаходкамі, але і арыгінальнымі фактурнымі, рытмічнымі прыёмамі, якія сведчаць аб тым, што аўтар добра валодае сучаснай кампазітарскай тэхнікай. Безумоўна, захапленне "тэхналогіяй" адбілася ў гэтым творы ў выглядзе некаторых празмернасцей. Але гэты эксперымент з'яўляецца важным крокам на шляху да валодання сучаснымі сродкамі пісьма.

Такім чынам, назіранні за творчасцю маладых беларускіх кампазітараў сведчаць аб тым, што ў цэлым плённа развіваюцца традыцыі папярэдніх дзесяцігоддзяў. Але ўсё ж маладым аўтарам удалося сказаць нямала свайго ў шматгалоссі сучаснай беларускай музыкі.

**Т.І.Чаплыгіна,**
**Н.Я.Петушко,** *выкладчыкі*

## ВЫКАРЫСТАННЕ НАРМАТЫЎНА-МЕТАДЫЧНАЙ ДАКУМЕНТАЦЫІ Ў ВЫКЛАДАННІ КУРСА БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАГА МЕНЕДЖМЕНТУ

Курс бібліятэчна-інфармацыйнага менеджменту з'яўляецца адной з вядучых вучэбных бібліятэказнаўчых дысцыплін. Яго вывучэнне абавязковае для ўсіх студэнтаў факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм.

Галоўная мэта курса — даць бібліятэчнаму менеджэру неабходныя веды аб тым, як кіраваць бібліятэкай у новых, дынамічна зменлівых рыначных умовах.

У працэсе вывучэння студэнты знаёмяцца са знешнім і ўнутраным асяроддзем функцыянавання бібліятэкі, з рэгуляваннем яе эканамічных адносін з партнёрамі і